**УРАЧЫСТАСЦЬ**

# Ганаровая і прыгожая традыцыя

**Лаўрэатаў звання «Чалавек года Віцебшчыны» ўшанавалі ў мінулую пятніцу, 9 лютага. Высокай узнагароды ўдастоены 50 прадстаўнікоў розных сфер дзейнасці. У іх ліку настаўніца хіміі Міёрскай СШ № 2 імя М. Ізварына Алёна Яфімава.**

Праходзіла ўрачыстасць у абласной філармоніі. Як адзначыў старшыня Віцебскага аблвыканкама **Аляксандр Субоцін**, ушанаванне лаўрэатаў звання «Чалавек года Віцебшчыны» – ганаровая і прыгожая традыцыя ў рэгіёне. Заўважыў, што ў чарговай кагорце шмат прадстаўнікоў рабочых прафесій: слесары, тынкоўшчыкі, ткачы, муляры, кіроўцы, аператары, трактарысты. Разам з імі на адной сцэне – урачы і педагогі, інжынеры і тэхнолагі, заатэхнікі і аграномы.

Урачыстую цырымонію прадоўжыў вядомы калектыў філармоніі – ансамбль танца, музыкі і песні «Талака». ■






Кацярына РЫНКЕВІЧ,
s.katrin.r@mail.ru